УДК 328:336.22 ([476+474.5+477.8]-89)(091)"1593 / 1598»

**У. А. Падалінскі**

# УХВАЛЕННЕ ПАДАТКАЎ НА ВАЛЬНЫХ СОЙМАХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ЯК ФАКТАР ПАЛІТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ (1593-1598 гг.)

Прызначэнне падаткаў заўсёды было адным з важнейшых пытанняў сацыяльна-палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай. Пастаянных прыбыткаў дзяржаўны скарб меў мала, кароль польскі і вялікі князь літоўскі не мог ажыццяўляць больш-менш сур'ёзныя крокі ва ўнутранай і знешняй палітыцы толькі за кошт свайго дамена, а прызначаць падаткі можна было выключна са згоды вальнага сойма.[1] У такой сітуацыі пастаянна ўзнікала неабходнасць звяртацца да «палітычнага народа» Рэчы Паспалітай, каб ухваліць новыя аднаразовыя пабора з насельніцтва. Аднак далёка не заўсёды планы кіраўніка дзяржавы супадалі з інтарэсамі шляхты. Вакол прызначэння падаткаў на соймах і сойміках разгараліся напружаныя спрэчкі. Ухваленне пабораў часта пераходзіла з сацыяльна-эканамічнай сферы ў палітычную. Прыкладам гэтаму можа быць канфлікт паміж каралём і вялікім князем Жыгімонтам Вазам і палітычнай элітай Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) вакол ухвалення падаткаў у 1593 і 1595 гг.

Структура і функцыянаванне фінансавай сістэмы Рэчы Паспалітай канца XVI ст. разглядалася галоўным чынам у польскай гістарыяграфіі.[2] Так, Я. Жоньца адлюстраваў спрэчкі вакол ухвалення падаткаў падчас соймавых кампаній 1597 і 1598 гг.[3] Непасрэдна скарбу ВКЛ прысвечаны працы А. Філіпчак-Коцур.[4] Яна ж закранула ў сваіх даследаваннях і канфлікт вакол падаткаў 1593 і 1595 гг., але толькі ў агульных рысах. Паспрабуем раскрыць гэтае пытанне з дапамогай больш шырокага кола матэрыялаў, што датычаць грамадска-палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай 1590-х гг., прыцягнуўшы звесткі з новых крыніц.

[1] *Volumina Constitutionum. T. II, vol. 1. S. 329, 369.*

[2] *Pałucki W. Drogi i bezdroża skarbowości polskiej XVI i pierwszej połowy XVII wieku; Skarbowość w Polsce i jej dzieje za Stefana Batorego;*
*Wisner H. Próby utworzenia skarbu stałego na Litwie. S. 85-89.*

[3] *Rzońca J. Sejmy z lat 1597 i 1598;*
*Idem. Rzeczpospolita Polska w latach 1596-1599..*

[4] *Filipczak-Kocur A. Podatki Litewskie w świetle uchwał sejmowych (1587-1632). S. 113-132;*
*Eādem. Z dziejów litewskiego skarbu nadwornego za Zygmunta III Wazy. S. 77-86;*
*Eādem. Skarb litewski za pierwszych dwu Wazów. 1587-1648.*
*Звесткі вышэйпералічаных прац абагульнены і дапрацаваны ў найноўшай*



pawet.net

Супярэчнасці паміж Жыгімонтам Вазам і палітычнай элітай ВКЛ пачаліся з самага пачатку яго панавання ў Рэчы Паспалітай. Адбілася гэта і на зацвярджэнні падаткаў. Ужо на каранацыйным сойме 1587 / 1588 г. літвіны, спаслаўшыся на рашэнні з'езда 1587 г. у Берасці, адмовіліся ўхваляць падатак.[5] Не прызналі прадстаўнікі ВКЛ і падатковых рашэнняў сойма 1590 г. – з-за нежадання Жыгімонта Вазы, насуперак настойлівым просьбам літвінаў, накіраваць у Маскоўскую дзяржаву пасольства і ратыфікаваць з ёй мір, заключаны яшчэ ў 1587 г.[6] На наступным сойме 1590 / 1591 г. земскія паслы Вялікага Княства, спаслаўшыся на абмежаваныя паўнамоцтвы, пытанне аб зацвярджэнні пабору перанеслі на абмеркаванне рэляцыйных соймікаў у паветах[7]. У пачатку 1592 г. падаткі зноў сталі прычынай канфлікту паміж Жыгімонтам Вазам і палітычнай элітай ВКЛ. Кароль і вялікі князь склікаў на 23 лютага ў Вільні Галоўны з'езд з мэтай ухвалення падатку на забеспячэнне ўласных фінансавых патрэбаў, у т. л. і звязаных са сваім будучым вяселлем.[8] Ініцыятыва выклікала сур'ёзны раскол сярод шляхты і кіруючых колаў Княства. Супраць выступіў віленскі ваявода Крыштоф Радзівіл, які лічыў, што з'езд скліканы супраць права, бо прызначаць падаткі можна было толькі са згоды сойма. У той жа час, трокскі ваявода Мікалай Крыштоф Радзівіл і канцлер Леў Сапега выступілі на баку караля. Віленскі і лідскі соймікі забаранілі сваім пасламухваляць нейкія субсідыі, соймік Менскага павета нават не абраў дэпутатаў, а вось соймік у Троках падтрымаў намеры Жыгімонта Вазы.[9] У выніку, Галоўны з'езд ВКЛ 1592 г. так і не прыняў аніякіх пастаноў.[10]

Выкажам меркаванне, што адмова ўхваляць падатак у 1592 г. была звязана не толькі з супярэчнай праву мэтай склікання Галоўнага з'езда. З 1591 г. «палітычны народ» ВКЛ супрацьстаяў прызначэнню Жыгімонтам Вазам на пасаду віленскага біскупа паляка – луцкага біскупа Бернарда Мацяёўскага. Ужо на Галоўным з'ездзе 1591 г. супраць гэтай намінацыі выступілі 11 сенатараў, у т. л. і найбольш уплывовыя дзеячы Вялікага Княства.[11] Літвіны імкнуліся адстаяць сваё выключнае права займаць усе пасады ў ВКЛ, а адным са сродкаў ціску на пазіцыю Жыгімонта Вазы для палітычнай эліты Княства стала згода на падаткі.

Вальны сойм Рэчы Паспалітай 1593 г. быў у асноўным прысвечаны плануемай паездцы Жыгімонта Вазы ў Швецыю. У лістападзе 1592 г. памёр шведскі кароль Ёхан III, бацька Жыгімонта. Перад каралём польскім і вялікім князем літоўскім

[5] Archiwum Domu Sapiehów... S. 30-31; Lepszy K. Walka stronnictw w pierwszych latach panowania Zygmunta III. S. 175-176.

[6] Konopczyński W. Liberum veto: studyum porównawczo-historyczne. S. 433-435.

[7] НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 283. Арк. 79-79адв., 81-81адв., 82адв.– 83адв.; VL. T. 2. 1859. S. 333. AGAD. AR. Dz. II. Nr. 246A; ADS, s. 61; Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569-1763. S. 252-253.

[8] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł «Sierotka» (1549-1616) wojewoda wileński. S. 281; Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 253.

[9] ADR. S. 211-213.

[10] Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 253

[11] AGAD. AR. Dz. II. Nr. 294. S. 4-6.



pawet.net

адкрывалася магчымасць стаць яшчэ і каралём Швецыі. Скліканы сойм павінен быў даць дазвол Жыгімонту Вазе на выязд за межы Рэчы Паспалітай і забяспечыць фінансаванне.

Сенат і пасольская ізба не вельмі прыхільна аднесліся да мяркуемага падарожжа. Праца ўскладнялася спрэчкамі аб віленскім біскупстве і рэлігійным міры ў краіне. Пасля таго, як Жыгімонт Ваза пайшоў на саступкі шляхце, у прыватнасці, абяцаў далучыць да Рэчы Паспалітай Эстляндыю, ён атрымаў згоду на візіт у Швецыю, абяцаўшы на працягу года вярнуцца назад.[12] Быў зацверджаны падатак на выправу Жыгімонта Вазы ў сваё дзедзічнае каралеўства, а таксама на абарону Рэчы Паспалітай у час адсутнасці караля ў краіне. ВКЛ павінна было выдаткаваць на паездку 100000 польскіх злотых. Аднак прадстаўнікі Вялікага Княства, як і некаторыя ваяводствы і землі Польшчы, з-за абмежаваных паўнамоцтваў ад сваіх выбарцаў, не згадзіліся ўхваліць пабор на сойме і перанеслі яго абмеркаванне на рэляцыйныя соймікі, прызначаныя на 20 ліпеня 1593 г.[13]

Жыгімонт Ваза, зацікаўлены ў хутчэйшым зацвярджэнні падаткаў, пасля сойма склікаў у Вільні на 30 ліпеня 1593 г. Галоўны з'езд.[14] Кароль з вялікай доляй верагоднасці мог спадзявацца на спрыяльны для сябе вынік. Палітычная эліта ВКЛ у цэлым падтрымлівала намеры Жыгімонта Вазы паехаць у Швецыю і захаваць за сабой шведскую карону, бо пры адзіным уладары зніклі б падставы для ўзброенага канфлікту Рэчы Паспалітай са Швецыяй за Інфлянты. Шляхта была зацікаўлена і ў далучэнні да Рэчы Паспалітай Эстоніі. У сваю чаргу, спакой у гэтых правінцыях добра адбіўся б на гандлёвым патэнцыяле Рыгі, што з'яўлялася надзвычай важным для экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі з ВКЛ.[15]

Сапраўды, Галоўны з'езд 7 жніўня 1593 г. ухваліў патрэбныя падаткі. На выправу ў Швецыю накіроўваліся ланавы падатак (стаўка 15 грошай з лану) з шосам і пагалоўны пабор з яўрэяў (15 гр. «з кожнай галавы»). На з'ездзе таксама ўхвалілі чопавы падатак на забеспячэнне абароны ВКЛ ад магчымага ўварвання татар.[16] Аднак пастанова з'езда ўтрымлівала адну надзвычай важную агаворку.

Прысутныя ў Вільні сенатары і паслы ад шляхты прасілі Жыгімонта Вазу надаць перад ад'ездам у Швецыю віленскае біскупства літвіну. Яны лічылі, што намінацыя паляка на першы духоўны ўрад ВКЛ супярэчыць праву, рашуча заяўлялі, што не дапусцяць, каб Б. Мацяёўскі атрымаў біскупства: «У тым абяцаем сабе словам нашым шляхецкім, што

[12] *AGAD. Archiwum Publiczne Potockich. Zbior Dyaryuszów seytowych za panowania Zygmunta III. T. 1 (1585-1607). S. 478-531;*
*Жукович П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г.). С. 85-89;*
*ADR. S. 112; ADS. S. 76-77;*
*Rzońca J. Rzeczpospolita Polska… S. 152;*
*VL. T. 2. S. 341;*
*Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasów Zygmunta III i Władysława IV Wazy. S. 91.*

[13] *VL. T. 2. S. 348.*

[14] *Rachuba A. Wielkie Księstwo… S. 254.*

[15] *Wisner H. Opinia szlachecka Rzeczpospolitej wobec polityki szwedzkiej Zygmunta III w latach 1587-1632.*

[16] *РНБ. Фонд 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 33-34.*
*РНБ. Ф. 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 33отв.; AGAD. AR. Dz. II. Nr. 257. S. 1-2.*

адзін другога адступіць не можам, усе разам стаяць жадаем і будзем». Асабліва зазначалася: «калі б Я [го] К [аралеўская] М [іласць] тых артыкулаў, якія правоў, вольнасцей нашых датычаць, не задаволіў, тады паны дэпутаты з адасланнем таго пабору да яго каралеўскай міласці затрымацца маюць да таго часу, пакуль бы з усімі намі ў тым паразумеліся і паведамленне ад нас усіх атрымалі, што з тым далей рабіць павінны будуць».[17]

Такім чынам, літвіны ўхвалілі падатак на паездку Жыгімонта Вазы ў Швецыю, але яго выплату паставілі ў залежнасць ад сваіх патрабаванняў. Да караля і вялікага князя з Вільні накіравалася пасольства ковенскага земскага пісара Міхаіла Сумарока і Яна Корсака.[18] Аднак Жыгімонт Ваза адправіўся ў Шведскае каралеўства, так і не задаволіўшы пастулатаў Галоўнага з'езда. У сваю чаргу, шляхта ВКЛ успрыняла гэта як «няласку» з боку Жыгімонта і збіраць падатак не стала. У паветах нават не хацелі выбіраць пaборцаў. Увосень 1594 г., ужо пасля вяртання са Швецыі, кароль у лісце да Я. Абрамовіча нагадаў пра абяцаны літвінамі пабор. Менскі ваявода адказаў, што галоўнай перашкодай у яго выдачы з'яўляецца канфлікт вакол віленскага біскупства[19]. Супярэчнасці паміж Жыгімонтам Вазай і палітычнай элітай ВКЛ паглыбляўся ўсё больш і больш.

Тым не менш, Жыгімонт Ваза не збіраўся адступаць ні ў справе з віленскім біскупствам, ні ў выплаце ў надворны скарб 100000 зл. З аднаго боку, ён спрабаваў перацягнуць на свой бок частку кіруючых колаў ВКЛ. Яшчэ ў маі 1594 г. з'явілася інфармацыя аб нейкай згодзе паміж братамі Хадкевічамі – Юрыем, старостам жамойцкім, і Еранімам, ваяводам мсціслаўскім. Нібыта ў выпадку атрымання апошнім вельмі прыбытковага берасцейскага староства Хадкевічы, а значыць і залежная ад іх шляхта, гатовы былі згадзіцца на выплату пабору і не пярэчыць каралю і вялікаму князю ў намінацыі паляка віленскім біскупам.[20] Безумоўна, такія пагадненні не былі магчымы без інспірацый з боку каралеўскага двара. Былі ў Вялікім Княстве і тыя, хто больш лаяльна ставіліся да палітыкі Жыгімонта Вазы і не хацелі абвастрэння адносінаў як паміж каралём і літвінамі, так і паміж ВКЛ ды Польшчай. Л. Сапега ў сакавіку 1594 г. у лісце да К. Радзівіла даводзіў, што літвінам, зважаючы на ўмовы Люблінскай уніі і небяспеку для Польшчы з боку татар, неабходна дапамагчы палякам.[21] Зразумела, што такой дапамогай магла быць і згода на падаткі. З другога боку, двор аказваў ціск на шляхту Вялікага Княства праз судовую сістэму. Вядома, што ў 1594 г. у справе нявыдачы пабору

[17] *Цыт. паводле: РНБ. Ф. 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 36отв.– 37, 39-39отв.*

[18] *Лаппо И. И. Люблинская уния… С. 121.*

[19] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 305. S. 3; Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej… S. 270, 365.*

[20] *ADS. S. 89.*

[21] *ADR. S. 215.*

ў Трыбунал ВКЛ быў «пазваны» паборца Аршанскага павета падстолі аршанскі Ян Вадэрацкі. Аднак і на гэты раз шляхецтва праявіла паслядоўнасць і салідарнасць: «Су*д* Трыбуна*л*ски*й* вси*х* побо*р*цо*в* на о*н* ча*с* во*л*ны*м* в то*м* поборе чынечы у вину и*х* не кла*л*, але до згоды вси*х* обывателе*й* великого кня*з*ства Литовского о*т*ложылъ».[22] У тым жа 1594 г. аршанская шляхта пацвердзіла, што выдаваць пабор не будзе.[23]

6 лютага 1595 г. у Кракаве Жыгімонт Ваза склікаў чарговы вальны сойм. Мэтай яго павінна было стаць усебаковае забеспячэнне абароны Рэчы Паспалітай у сувязі з магчымай вайной з Турцыяй і татарамі. У ВКЛ чакалі, што на павятовых сойміках будзе ўзнята пытанне аб выплаце пабору 1593 г., але ў каралеўскай перадсоймавай інструкцыі непасрэдна пра ўхваленне падаткаў нічога не гаварылася – верагодна, каб не абвастраць апазіцыйных настрояў сярод шляхты. Як інфармаваў 23 снежня 1594 г. К. Радзівіла Я. Абрамовіч, «перашкода для выбірання пабору – толькі біскупства».[24]

Скліканне сойма ў Кракаве, а не ў Варшаве, як вызначалі канстытуцыі Люблінскага сойма 1569 г., стала прычынай значнай незадаволенасці і ў Польшчы, і ў ВКЛ. К. Радзівіл фактычна пайшоў на адкрыты канфлікт з каралём і вялікім князем. Віленскі ваявода расцэньваў правядзенне сойма ў Кракаве як спробу Жыгімонта Вазы і палякаў усё ж дабіцца прызначэння Б. Мацяёўскага віленскім біскупам і прапаноўваў на сойм не ехаць, а толькі адправіць дэлегацыю з Галоўнага сойміка ў Слоніме.[25]

Земскія паслы ВКЛ усё ж прыбылі ў Кракаў, але на самым пачатку сойма адмовіліся абмяркоўваць абарону Рэчы Паспалітай ці прыступаць да якіх-небудзь іншых спраў, пакуль віленскае біскупства не будзе нададзена літвіну. Жыгімонт Ваза гэтых патрабаванняў не выканаў і абвінавачваў К. Радзівіла, што той імкнецца сарваць сойм. Тым не менш, паслы Вялікага Княства не сарвалі працу сойма, а далучыліся да яго рашэнняў.[26] Магчыма, гэта было заслугай прысутных у Кракаве сенатараў-раялістаў: М. К. Радзівіла, Ю. Хадкевіча, Л. Сапегі, падканцлера Г. Войны, Д. Халецкага.[27]

Праўда, далучыліся літвіны да рашэнняў сойма толькі часткова. У Кракаве былі ухвалены ланавы (стаўка – 1 зл. з лану) і чопавы падаткі, мыта (цло) і «пагалоўнае жыдоўскае», але прадстаўнікі ВКЛ, з-за абмежаваных паўнамоцтваў, адмовіліся ўхваляць пабор на сойме і перанеслі яго разгляд на рэляцыйныя соймікі.[28] А на заключным пасяджэнні сойма ад імя ўсіх паслоў ВКЛ перад Жыгімонтам Вазам выступіў

[22] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 273адв.*

[23] *Тамсама. Арк. 273 адв.– 274.*

[24] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 325. S. 1-7.*

[25] *Падалінскі У. Грамадская думка шляхты Вялікага Княства Літоўскага канца XVI ст.… С. 12-24.*

[26] *Лаппо И. И. Люблинская уния… С. 127-130; ADR. S. 217; ADS. S. 100, 102-104; AGAD. AR. Dz. V. Nr. 1901. Cz. II. S. 7.*

[27] *ADS. S. 103, 110; Seredyka J. Senatorowie Rzeczypospolitej na sejmach Zygmunta III Wazy (1587-1632). S. 176.*

[28] *Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej… S. 270-271; VL. T. 2. S. 355-363.*

[29] *Лаппо И. И. Люблинская уния… С. 128-129; ADR. S. 221.*

ашмянскі пасол, каралеўскі сакратар Ян Чыж. Ён заклікаў караля захоўваць правы і свабоды Княства, прызначыць віленскага біскупа «з нашага народа» і папярэдзіў, што ў выпадку невыканання гэтых просьбаў шляхта ВКЛ можа не выканаць рашэнняў сойма.[29]

Адразу пасля заканчэння сойма Жыгімонт Ваза імкнуўся праз сваіх прыхільнікаў схіліць «палітычны народ» Княства да ўхвалення падатку 1595 г. і выдання пабору 1593 г. У красавіку Л. Сапега ў сваіх лістах перадаваў К. Радзівілу асабістую просьбу Жыгімонта Вазы дапамагчы паўплываць на шляхту з мэтай хутчэйшага зацвярджэння і выдачы патрэбных падаткаў для наёму войска ды дапамогі палякам у вайне з татарамі.[30] Заклікаў віленскага ваяводу не абмінуць магчымасці наймаць жаўнераў, як толькі будзе выданы пабор, і Д. Халецкі.[31] Цалкам верагодна, што іншыя сенатары-раялісты таксама рабілі падобныя захады. Аднак хваля незадаволенасці сярод шляхты ВКЛ толькі шырылася. і ў значнай ступені гэта было выклікана зместам выданых соймавых канстытуцый і падатковага універсала.

Ва універсале вызначаўся парадак збору прынятых у Кракаве падаткаў, але не адзначалася, што паслы ВКЛ перанеслі іх ухваленне на паслясоймавыя соймікі. Да таго ж соймам зацвярджаўся і пабор 1593 г., а 100000 зл. з яго накіроўваліся на патрэбы Жыгімонта Вазы. Пра асаблівыя ўмовы літвінаў, вылучаныя каралю на з'ездзе, ва універсале не згадвалася зусім.[32]

Непасрэдна пасля сойма ў люблінскія гродскія кнігі была ўнесена пратэстацыя віленскага пасла Аляксандра Хадкевіча. У ёй гаварылася, што ў надрукаваныя канстытуцыі і універсал былі ўнесены рэчы, «аб якіх на сойме ніякай згадкі не было», у прыватнасці, аб прызначэнні пабору 1593 г. на патрэбы Жыгімонта Вазы.[33] У чэрвені 1595 г. Л. Сапега мусіў апраўдвацца, што з-за адмовы паслоў ВКЛ ухваляць пабор, падатковы універсал рэдагавалі канцлер Кароны Ян Замойскі і некалі польскіх паслоў, а канцылярыя Вялікага Княства ніякага дачынення да гэтага не мела і апавясціла ўсе паветы ВКЛ, што іх паслы на сойме нічога не ўхвалялі, і адпаведны запіс быў унесены ў канцылярскія кнігі.[34]

Больш яскрава настроі шляхты праявіліся на павятовых рэляцыйных сойміках ВКЛ, скліканых Жыгімонтам Вазам 5 мая 1595 г.[35] Што датычыць новых падаткаў, прынятых у Кракаве, то шляхта гатова была іх ухваліць, але з пэўнымі ўмовамі. Віленскі соймік, спасылаючыся на ўмовы уніі,

[30] *ADS. S. 107-108; ADR. S. 218-219.*

[31] *AGAD. AR. Dz. V. Nr. 1901. Cz. II. S. 12.*

[32] *VL. T. 2. S. 362.*

[33] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 326. S. 1.*
*Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 271, 365.*

[34] *ADR. S. 220-221.*

[35] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 294. S. 1-2.*
*Падалінскі У. Грамадская думка шляхты... С. 20-21.*

не хацеў зацвярджаць падаткі, пакуль усе жыхары Польшчы не згадзяцца на пабор, вызначаны на сойме.[36] Ашмянскі, Аршанскі і Менскі соймікі, зважаючы на небяспеку для Рэчы Паспалітай і ўсяго хрысціянства, а таксама на «братэрскую міласць» да палякаў, якім туркі ды татары пагражалі больш, чым літвінам, згадзіліся на пабор, але збіраць яго можна было толькі пасля згоды ўсіх станаў ВКЛ.[37] Калі аршанская шляхта магчымасць для такой «згоды» бачыла на наступным вальным сойме, то віленская і жамойцкая шляхта для абмеркавання і ўхвалення пабору 1595 г. прасіла склікаць у Княстве Галоўны з'езд.[38] Шляхта Упіцкага павета ўвогуле адмаўлялася падтрымліваць што-небудзь з прапаноў караля без згоды «старшых паноў», у прыватнасці, К. Радзівіла, і таксама прасіла склікаць Галоўны з'езд.[39]

Віленскі, Менскі і Аршанскі соймікі адносна падаткаў 1593 г. нагадалі, што яны былі ўхвалены Галоўным з'ездам з пэўнымі ўмовамі да Жыгімонта Вазы. Кароль іх не выканаў, таму падаткі «нідзе ў ВКЛ не выдавалі».[40] Менская шляхта зазначала, што без супольнай згоды ўсіх станаў Княства выдачу 100000 зл. абмяркоўваць не будзе, тым больш, што пра тыя падаткі не было згадкі ні на сойміках перад соймам 1595 г., ні на Галоўным сойміку ў Слоніме, ні на самім сойме ў Кракаве.[41] Да «згоды ўсіх станаў» ВКЛ адкладала рашэнне па артыкулах з каралеўскай прапазіцыі, «аб якіх на сойме згоды ці згадкі не было», і ашмянская шляхта. Верагодна, пад гэтай фармулёўкай хаваліся і пытанне аб паборы 1593 г. Ашмянскі павет, пры ўсеагульнай згодзе ў Княстве, гатовы быў падтрымаць гэтыя артыкулы, калі яны прынясуць карысць Рэчы Паспалітай, не будуць парушаць правоў і вольнасцей шляхты. Разам з тым, выказвалася спадзяванне, што і Жыгімонт Ваза выканае ўсе просьбы ад станаў ВКЛ.[42]

Такім чынам, рэляцыйныя соймікі ў ВКЛ прайшлі зусім не па задуме двара. Шляхта не збіралася без выканання сваіх патрабаванняў выплачваць пабор 1593 г., а ўхваленне падаткаў 1595 г. адкладалася на нявызначаны тэрмін. Згода на падаткі стала важным інструментам палітычнага ціску на караля ў справе аб віленскім біскупстве. У сваю чаргу, Жыгімонт Ваза ў 1595 г. Галоўны з'езд ВКЛ не склікаў.[43] Магчыма, ён апасаўся, што з'езд стане нагодай для «апазіцыйнага» кансалідаванага выступлення шляхты, і паспрабаваў дасягнуць ухвалення і атрымання падаткаў іншым шляхам.

20 ліпеня 1595 г. Жыгімонт Ваза выслаў дзяржаўцам гаспадарскіх уладанняў у ВКЛ лісты, у якіх заклікаў іх хутчэй

[36] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 303. S. 3-4.*

[37] *Ibidem. Nr. 301. S. 3-4; Nr. 305. S. 1; Nr. 307. S. 1-2.*

[38] *Ibidem. Nr. 301. S. 3-4; Nr. 303. S. 4; Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 255.*

[39] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 300. S. 1-2.*

[40] *Ibidem. Nr. 301. S. 4; Nr. 303. S. 4-5; Nr. 305. S. 3.*

[41] *Ibidem. Nr. 305. S. 3.*

[42] *Ibidem. Nr. 307. S. 2.*

[43] *ADR. S. 220; ADS. S. 107; Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 255.*

выдаваць абодва паборы. Адносна падаткаў 1595 г. адзначалася, што на большасці рэляцыйных соймікаў «… на выдаване тоги побору водлуг постановеня соймового станы Великого князства Литовского зrодили се».[44] Аб паборы 1593 г. нагадвалася, што ён на Галоўным з'ездзе ВКЛ быў «на потребы нашы позволеный» (пра ўмовы, вылучаныя Жыгімонту Вазе тым з'ездам, ні словам не згадваліся) і ўжо нібыта «снат и выбран ест».[45] Разам з лістом быў высланы і універсал з апісаннем парадку збору гэтых пабораў.

Зусім іншая трактоўка падзей была, прынамсі, у частцы шляхты Вялікага Княства. У верасні 1595 г. на пасяджэнні Трыбунала ВКЛ у Менску былі прынесены лісты і падатковы універсал, адрасаваныя да Менскага ваяводства. Шляхта выступіла з пратэстам і накіравала да Жыгімонта Вазы Фёдара Волка з адпаведным пасланнем. У ім шляхта ацэньвала выданне падатковага універсала праз некалькі тыдняў пасля заканчэння сойма не інакш як «прыватным станаўленнем пабораў», што было «не толькі вялікай абразай правоў і вольнасцей нашых, але… канчатковай згубай і выкараненнем іх». Яшчэ раз нагадвалася, што пабор 1593 г. быў ухвалены з «пэўнымі кандыцыямі», і выказвалася спадзяванне, што кароль і вялікі князь адменіць гэтыя «прыватныя» і «шкадлівыя» універсалы.[46] Сярод падпісантаў не было ніводнага сенатара, а толькі прадстаўнікі павятовай шляхты, у т. л. падкаморы ашмянскі Мікалай Зяновіч, гаспадарскі маршалак Васіль Зянковіч Ціхінскі, полацкі земскі суддзя Есіф Корсак, падкаморы слонімскі Рыгор Трызна, Ян Корсак Галубіцкі, Каспар Сясіцкі, Крыштоф Юндзіл і інш.[47] У пратэсце можна прасачыць уплыў К. Радзівіла. М. Зяновіч быў намеснікам віленскага ваяводы, Ф. Волк – кліентам біржанскіх Радзівілаў. Блізкімі да Радзівілаў былі і роды Сясіцкіх, Трызнаў, Юндзілаў, Корсакаў Галубіцкіх.[48]

Таксама ў верасні 1595 г., у сувязі з абраннем новага жамойцкага старосты, у Жамойць былі накіраваны каралеўскія лісты, якія заклікалі шляхту выдаваць падскарбію Д. Халецкаму два паборы і без склікання Галоўнага з'езда. Вядома, што Я. Абрамовіч упэўніваў жамойцкую шляхту, каб «цвёрда трымалася», г. зн. пабора не выдавала.[49]

Аднак Жыгімонт Ваза не адступаў і зноў 18 верасня 1595 г. заклікаў сенатараў Вялікага Княства пачаць выплачваць падаткі і паўплываць на шляхту, але безвынікова – грошы да канца года ў скарб не паступілі.[50] Было відавочна, што ўхваленне спрэчных падаткаў не можа быць вырашана без абмеркавання на будучым вальным сойме.

[44] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 311. S. 1.*

[45] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 311. S. 1.*

[46] *Biblioteka Miejska im. Raczyńskich w Poznaniu. Rkps. 88. Listy do Sapiehów z lat 1502-1659. K. 91.*

[47] *Усяго надпісалася 17 шляхціцаў.*

[48] *Kempa T. Urzędnicy i klienci… S. 200; Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios… P. 325, 335, 368, 372, 373.*

[49] *AGAD. AR. Dz. V. Nr. 16. S. 41-42.*

[50] *Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej… S. 272.*

Тым не менш, настроі ў ВКЛ адносна выплаты падаткаў пачалі змяняцца. Верагодна, гэта было звязана са складаным знешнепалітычным становішчам Рэчы Паспалітай. Зноў з'явілася небяспека ўварвання татар. Восенню 1595 г. на абарону паўднёвых межаў рушыў Я. Замойскі з польскім войскам. У Польшчы нарастала незадаволенасць пазіцыяй літвінаў у справе абароны краіны, палякі наракалі, што Вялікае Княства не выконвае ўмоў уніі. Я. Замойскі ў пачатку 1596 г. у лісце да К. Радзівілу па сутнасці абвінавачваў Княства ў ігнараванні патрэбаў абароны Рэчы Паспалітай. Ды і ў ВКЛ былі незадаволеныя тым, што нічым не дапамаглі польскаму войску (напр., Л. Сапега).[51] і калі абарона паўднёвых межаў Польшчы магла не вельмі турбаваць шляхту ВКЛ, то хутка небяспека прыйшла і ў іх дом.

У тую ж восень 1595 г. казацкія аддзелы Севярына Налівайкі з Украіны перайшлі на тэрыторыю Беларусі, захапілі Слуцк, а 13 снежня – Магілёў.[52] У пачатку 1596 г. шляхта некаторых паветаў і ваяводстваў ВКЛ выходзіла ў паспалітае рушанне ці наймала за свае грошы жаўнераў для падаўлення бунту.[53] Жыгімонт Ваза гатовы быў накіраваць на дапамогу 2000 жаўнераў, але нагадваў, што грошай на гэта няма ні ў надворным, ні ў земскім скарбе.[54] І хаця канфлікт вакол віленскага біскупства толькі паглыбляўся, але сярод палітычнай эліты расло разуменне, што без новых фінансавых сродкаў эфектыўнае і бяспечнае існаванне краіны немагчыма. 25 студзеня 1596 г., незадоўга да перадсоймавых соймікаў ВКЛ, Л. Сапега выказаў думку, напэўна, блізкую значнай частцы «палітычнага народа» Княства: «Трэба трымацца біскупства цвёрда, але і іншых спраў з-за гэтага не ўпускаць, асабліва, што датычыць бяспекі дзяржавы».[55] Відавочна, ужо з'яўляецца імкненне не звязваць пытанне аб прызначэнні літвіна віленскім біскупам з пытаннем аб ухваленні падаткаў.

На разгляд павятовых соймікаў ВКЛ, скліканых перад вальным соймам 13 лютага 1596 г., Жыгімонт Ваза выносіў і пытанне аб падатках, прызначаных у 1593 і 1595 гг., але так і не выдадзеных.[56] На гэты раз пазіцыя шляхты ВКЛ была куды больш памяркоўнай.

У некаторых паветах пабор, прызначаны ў Кракаве, сталі збіраць ужо ў тым жа 1595 г. Да пачатку 1596 г. частку гэтых падаткаў выбралі пaборцы Ашмянскага, Віцебскага і Аршанскага паветаў.[57] На Галоўным сойміку ВКЛ у сакавіку 1596 г. літвіны тлумачылі затрымку ў выданні пабору 1595 г. тым, што такое пытанне «не магло быць вырашана без з'езда», г. зн.

[51] *ADR. S. 116; ADS. S. 111, 116.*

[52] *Свяжынскі У. М. «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага. С. 115;*
*Kempa T. Mikołaj Krzysztof... S. 286-287.*

[53] *РНБ. Ф. 971. Собрание автографов П. П. Дубровского. Авт. 321 / 1. № 21. Л. 1;*
*AGAD. AR. Dz. II. Nr. 329. S. 1; Nr. 336. S. 1; Nr. 338. S. 1; VL. T. 2. S. 364.*

[54] *ADS. S. 127.*

[55] *Ibidem. S. 125-126.*

[56] *РНБ. Ф. 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 205, 206отв.;*
*AGAD. AR. Dz. II. Nr. 346. S. 1-4.*

[57] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 249, 256;*
*AGAD. AR. Dz. II. Nr. 338. S. 1.*

без Галоўнага з’езда. Тым самым яны выракаліся абвінавачванняў ў ігнараванні патрэбаў Рэчы Паспалітай.[58]

Аб выданні пабору 1593 г. меркаванні разышліся. Соймік Навагародскага павета даручыў сваім паслам, каб яны на сойме «*то*т побо*р*… да*т* позволили», аднак толькі пры ўмове, «если бы на то згода всих стано*в* великого князства Литовского была».[59] Аршанская шляхта ў соймавай інструкцыі нагадвала, што пабор ухваляўся з пэўнымі ўмовамі, якія не былі выкананы («на тот часъ досыть не стало»), таму той падатак не выбіралі і грошай не маюць.[60] А вось вышэйшая частка палітычнай эліты ВКЛ, асабліва тыя, хто займаў прыдворныя ўрады, гатовы былі пагадзіцца выдаць пабор 1593 г. без усялякіх умоў. Так, на пасяджэнні перадсоймавага сойміка ў Вільні ў лютым 1596 г. за тое, каб аддаць 100000 зл. Жыгімонту Вазе, выказаліся Д. Халецкі, падчашы Крыштоф Дарагастайскі, крайчы Андрэй Война, віленскі цівун Ян Пац (заклікаў шляхту выдаць і пабор 1595 г.) і, увогуле, большасць прысутных.[61] Цікава, што кліенты біржанскіх Радзівілаў смаленскі кашталян Вацлаў Агрыпа, віленскія гродскія суддзя і пісар Габрыэль Рыпінскі і Шчасны Багуматка ў сваіх выступах на тым сойміку ні словам не закранулі пытанне выплаты спрэчнага падатку.[62]

Галоўны соймік 1596 г. схіляўся згадзіцца на збор пабору (1593 г.), але пры гэтым паслы павінны былі ўказаць каралю на вялікія спусташэнні ў Княстве (верагодна, гаворка ішла пра набег казакоў).[63] Сенатарам і паслам даручалася дамовіцца ў Варшаве, каб шляхце тых зямель ВКЛ, якая выходзіла ў паспалітае рушанне ці выдавала пабор на наём жаўнераў супраць казакоў, былі прадстаўлены льготы пры выплаце падаткаў, калі іх усё ж ухваляць на сойме, а найбольш пацярпелая шляхта Мазырскага і Рэчыцкага паветаў каб увогуле была вызвалена ад грашовых выплат.[64]

На вальным сойме 1596 г. паслы ВКЛ згадзіліся выдаць на патрэбы абароны Рэчы Паспалітай падаткі «паводле універсалу сойма кракаўскага», таксама ва ўсёй краіне было прызначана «пагалоўнае жыдоўскае».[65] Агаворвалася, што шляхта Менскага, Навагародскага і Упіцкага паветаў, якая ў пачатку года ўжо выплочвала пабор на абарону ад казацкага бунту, атрымае адпаведныя льготы пры выплаце падаткаў.[66] Дарэчы, маршалкам пасольскай ізбы быў абраны К. Дарагастайскі, які, што яскрава выявілася яшчэ на сойміку ў Вільні, займаў пракаралеўскую пазіцыю ў пытанні ўхвалення падаткаў.

Хаця ў соймавых канстытуцыях зусім не адзначалася, што прадстаўнікі ВКЛ згаджаюцца і на выплату пабору 1593 г.,

58 *РНБ. Ф. 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 205.*

59 *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 283.*

60 *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 346. S. 4.*

61 *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 356. S. 1-3.*

62 *Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios… P. 168, 306-307.*

63 *РНБ. Ф. 957. Pol. F. IV. № 130. Л. 206отв.*

64 *Там же. Л. 204отв.–205; AGAD. AR. Dz. II. Nr. 344. S. 2-3.*

65 *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 348a; VL. T. 2. S. 363-364.*

66 *VL. T. 2. S. 364.*



pawet.net

каралеўская ўлада разумела іх змест менавіта так. Пасля заканчэння сойма ў ваяводствы і паветы Княства на рэляцыйныя соймікі былі накіраваны гаспадарскія лісты «о выданье того побору», у якіх усім паборцам загадвалася адвозіць сабраныя грошы ў Вільню і рабіць перад падскарбіем справаздачу.[67] Жыгімонт Ваза, безумоўна, лічыў рашэнні гэтага сойма сваёй перамогай.

Аднак рэляцыйныя соймікі ў ВКЛ, якія павінны былі адбывацца ў пачатку чэрвеня 1596 г., прайшлі, прынамсі частка з іх, зусім не па сцэнары Жыгімонта Вазы. З аднаго боку, ухваленне пабору 1595 г. на мінулым сойме амаль не выклікала пярэчанняў.[68] За выключэннем толькі шляхты Рэчыцкага павета, якая заяўляла, што падаткі ў сувязі з набегам казакоў «давати не могуть и не хочу*т*», і прасіла Жыгімонта Вазу «о одъпушченье взглядо*м* знищенья того краю о*т* козаковъ, абы на ни*х* тотъ поборъ вытеганъ не былъ».[69] Грошы з гэтага пабору (1595 г.) сталі паступаць у земскі скарб ВКЛ недзе ўлетку 1596 г., і ўсяго было сабрана 118000 зл., без уліку воднага мыта і чопавага, якія трымаў у арэндзе скарбны ВКЛ Лукаш Мамоніч. З іх 67000 зл. былі выплачаны на ліквідацыю запазычанасці перад войскам, сабраным на падаўленне бунту С. Налівайкі.[70] Праўда, грошы збіраліся марудна, і не ўсе ваяводствы іх выдалі, таму Жыгімонт Ваза вынес пытанне выплаты падатку і на разгляд наступнага сойма, скліканага 10 лютага 1597 г.[71]

З іншага боку, з выдачай пабору 1593 г. зноў узніклі праблемы. У адных паветах згаджаліся на яго выплату, у іншых – не. Як паведамляў К. Радзівілу ў кастрычніку 1596 г. смаленскі ваявода Я. Абрамовіч, «пабор… у некаторых паветах і ваяводствах выбіраюць. У Вільні таксама, прыехаўшы з сойма, некалькі паноў маладых пастанавілі выдаваць (пабор – *Ул. П.*). У Ашмянах і ў Лідзе нават і не думаюць аб тым».[72] У такой сітуацыі Я. Абрамовіч прапаноўваў склікаць з’езд Віленскага ваяводства, на якім К. Радзівіл схіліў бы «Ашмяны, Ліду і іншыя паветы» да выдачы падаткаў. Разам з тым, смаленскі ваявода гатовы быў цалкам даверыцца меркаванню віленскага ваяводы і зазначаў, што калі К. Радзівіл дасць згоду выдаць пабор, то пагодзяцца і іншыя.[73] Невядома, каб такі з’езд адбыўся, але, напрыклад, ашмянская шляхта ўсё ж пачала выдаваць падатак. Да канца 1596 г. амаль увесь пабор, прынамсі, як сцвярджалася на сойміках перад соймам 1597 г., быў выдадзены ў Віленскім і Ашмянскім паветах.[74] Падаткі былі сабраны і ў Берасцейскім павеце, шляхта толькі прыспешвала

67 *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 283, 409адв.*

68 *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 239, 256, 287адв.*

69 *Тамсама. Арк. 270-270адв.*

70 *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 355. S. 2; Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 273, 357; Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach... S. 11-15.*

71 *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 322-331*

72 *AGAD. AR. Dz. V. Nr. 16. S. 46.*

73 *Ibidem.*

74 *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 405, 409-410.*

мясцовага паборцу сабраць грошы ў тых, хто іх яшчэ не выплаціў, і аддаць у рукі Д. Халецкага.[75] На Галоўным сойміку ВКЛ 30 студзеня 1597 г. пасол ад Жамойці Радзімінскі выказваўся за выплату абяцанага каралю пабору і заклікаў зрабіць тое ж самае і тых, хто не хоча яго выдаваць.[76]

Затое шляхта Лідскага, Навагародскага і Менскага паветаў заняла іншую пазіцыю. Галоўнае адрозненне было ў тым, што лідская і навагародская шляхта мелі зусім адрозны ад Жыгімонта Вазы погляд на вынікі мінулага сойма. А менавіта яна аспрэчвала падатковыя рашэнні сойма, каб мець такім чынам поўную свабоду дзеяння. В. Зянковіч Ціхінскі, навагародскі пасол на сойме 1596 г., адзначаў, што на тым сойме не было ўсеагульнай згоды дэлегацыі ВКЛ аб выдачы пабору 1593 г. і «оповеданья многие противъ тому уросли», г. зн. супраць такога рашэння ўносіліся пратэстацыі.[77] У інструкцыі паслам на сойм 1597 г., складзенай на сойміку ў Лідзе, адзначалася, што на мінулым сойме выплата падатку 1593 г. «не дазволена і апратэставана».[78] Разам з тым, навагародская шляхта на рэляцыйным сойміку пасля сойма 1596 г. абрала паборцам В. Зянковіча Ціхінскага, але сваім лістом абмежавала яго паўнамоцтвы: забараніла яму аддаваць сабраныя грошы каму-небудзь «бе*з* згоды вси*х* обывателе*й* земли Новгоро*д*ское».[79] А тая частка шляхты, якая не прысутнічала на сойміку, увогуле адмовілася ўхваляць і выдаваць пабор, спаслаўшыся на тое, што на рэляцыйным сойміку «нового на не*м* ничого станови*т*ся не могло».[80] Менскі рэляцыйны соймік таксама абраў павятовага паборцу – Васіля Балгарына. Аднак ён, як і паборца ў Навагародскім павеце, выбраўшы падатак, не мог нікому аддаваць грошы без волі і ведама ўсіх «абывацеляў» Менскага павета, пакуль тыя не ўбачаць «в то*м* усего велико*го* князства Литовского згоду певную о*д*ностa*й*ную…».[81] Лідскі соймік увогуле не дазволіў выдаваць падатак. Яшчэ раз лідская шляхта нагадвала, што пабор 1593 г. абяцала выдаць толькі пры выкананні пэўных умоў, чаго не адбылося. Шляхта Лідскага павета гатова была выдаць гэты пабор толькі пры ўмове, што на будучым сойме будзе на тое ўсеагульная згода і толькі на абарону ад небяспекі з боку Турцыі ды на наём жаўнераў.[82] Якую пазіцыю займалі іншыя паветы ВКЛ, нам невядома. Заўважым, што лідская шляхта ў другой палове 1590-х гг. знаходзілася пад значным уплывам К. Радзівіла.[83] Моцныя пазіцыі біржанская лінія Радзівілаў мела сярод навагародскай шляхты, залежалі ад іх і некаторыя ўплывовыя шляхецкія роды ў Менскім павеце – Валадковічы, Кавячынскія.[84] Падобна, што

[75] *АВАК. Т. 2. С. 151-152; Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 417.*

[76] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 422.*

[77] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 283.*

[78] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 413.*

[79] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 283-283адв.*

[80] *Тамсама. Арк. 283адв.*

[81] *Тамсама. Арк. 272-272адв.*

[82] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 413-414.*

[83] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 361, 383.*

[84] *Kempa T. Urzędnicy i klienci… S. 199-200, 204, 206-208; Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios… P. 365, 369, 374-376.*

К. Радзівіл не асабіста, але праз залежную шляхту імкнуўся блакіраваць выдачу пабору, прызначанага на асабістыя патрэбы Жыгімонта Вазы.

Палітычная эліта ВКЛ у пытанні выплаты пабору 1593 г. падзялілася. Частка па-ранейшаму трымалася ўмоў, вылучаных Жыгімонту Вазе на Галоўным з'ездзе ў 1593 г., і супраціўлялася выдаваць пабор да ўрэгулявання канфлікту вакол віленскага біскупства. Іншыя ж згаджаліся на яго выплату. Да пошукаў кампрамісу падштурхоўвалі як знешнія і ўнутраныя небяспекі для Рэчы Паспалітай, так і павага шляхты да каралеўскай улады. Усё ж ісці на адкрыты канфлікт з каралём і вялікім князем былі гатовыя далёка не ўсе. На сойміку ў Вільні ў лютым 1596 г. частка шляхты аргументавала сваю згоду выдаць пабор тым, што яна гэта Жыгімонту Вазе абяцала.[85] Так шляхцічы і саступалі патрабаванням караля, і захоўвалі свой твар адначасова. Разам з тым адзначым, што да пачатку 1598 г. «палітычны народ» ВКЛ скансалідавана абараняў свае правы і выступаў супраць намінацыі паляка на ўрад віленскага біскупа.[86]

На вальным сойме 1597 г. пытанне аб ухваленні новых падаткаў было адным з асноўных. Фінансавыя сродкі былі неабходныя на арганізацыю абароны Рэчы Паспалітай ад татар і турак, выплату запазычанасці жаўнерам, забеспячэнне памежных замкаў зброяй і людзьмі, на чарговыя «падарункі» татарам.[87] У ВКЛ ідэя чарговага пабору шырокай падтрымкі не атрымала. На Галоўным сойміку ў студзені 1597 г. за новыя падаткі выказаліся толькі паслы Віленскага і Навагародскага паветаў.[88] З сенатараў ВКЛ фінансавыя ініцыятывы Жыгімонта Вазы падтрымалі віленскі кашталян Е. Хадкевіч, які яшчэ ў канцы снежня 1596 г. у лісце на перадсоймавы соймік Віленскага павета заклікаў шляхту згадзіцца на падатак, а таксама Г. Война, які падчас сойма прапанаваў на абарону дзяржавы накіраваць некалькі пабораў разам.[89]

Сойм 1597 г. праходзіў у напружаных спрэчках паміж каралём, сенатарамі і пасламі, паміж Польшчай і Вялікім Княствам. Прадстаўнікі ВКЛ настойвалі на адмене намінацыі паляка Б. Мацяёўскага на пасаду віленскага біскупа. Ад вырашэння канфлікту залежала і пазіцыя літвінаў у справе абароны дзяржавы, але Жыгімонт Ваза па-ранейшаму настойваў на сваім рашэнні. У выніку, паслы ВКЛ у апошнія дні сойма фактычна байкатавалі паседжанні пасольскай ізбы і не ўдзельнічалі ў абмеркаванні соймавых спраў.[90] У перадапошні дзень сойма, 24 сакавіка, ад імя земскіх паслоў ВКЛ перад Жыгімонтам Вазам, сенатам і пасольскай ізбой выступіў

[85] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 356. S. 2.*

[86] *Лаппо И. И. Люблинская уния… С. 89-150; Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach… S. 67-82.*

[87] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 322-331.*

[88] *Ibidem. S. 420, 422. Ibidem. S. 58-59, 85, 420-422.*

[89] *РНБ. Ф. 971. Авт. 125. Л. 53отв.; Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 85.*

[90] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 1-124; Жукович П. Сеймовая борьба… С. 247-293; Лаппо И. И. Люблинская уния… С. 137-141; Rzońca J. Sejmy z lat 1597 i 1598…; Idem. Rzeczpospolita Polska w latach…*

[91] *Dyaryusze sejmowe roku 1597. S. 119.*

пасол Ашмянскага павета, каралеўскі сакратар Гальяш Пельгрымоўскі. Ён заявіў, што земскія паслы ВКЛ не згаджаюцца на ўхваленне падаткаў, але ў выпадку ўсеагульнай згоды на пабор гатовы будуць выставіць жаўнераў за свае грошы і пад кіраўніцтвам свайго гетмана.[91]

Аднак сойм закончыў працу, так і не прыняўшы ніякіх рашэнняў. Гэта прымусіла Жыгімонта Вазу больш актыўна шукаць крыніцы паступлення новых фінансавых сродкаў. Зразумела, што ў ВКЛ кароль і вялікі князь у першую чаргу разлічваў на атрыманне пабору, ухваленага ў 1593 г., і на выплату рэшты з пабору 1595 г. Пасля сойма ў паветы і ваяводствы Вялікага Княства, да ўсіх паборцаў, былі накіраваны гаспадарскія лісты аб выданні падатку 1593 г.[92] Падобна, што і К. Радзівіл заняў больш кампрамісную пазіцыю: у ліпені 1597 г. ён выступае ўжо як прыхільнік збору і поўнай выдачы спрэчнага пабору ў ВКЛ.[93] і ў 1597 г. грошы нарэшце сталі паступаць у каралеўскі скарб.

Захавалася справаздача Д. Халецкага, зробленая яшчэ да яго смерці, г. зн. недзе да 20 студзеня 1598 г., аб атрыманні грошай ад павятовых паборцаў. Так, у 1597 г. скарб атрымаў толькі 43341 зл. 4 гр. і 14 пенязяў.[94] Для параўнання, у 1591 г. падатак у ВКЛ па той жа стаўцы, што і ў 1593 г. (15 гр. з валокі), прынёс 74057 зл.[95] У поўным аб’ёме (прынамсі, скарб не меў да іх аніякіх прэтэнзій) пабор 1593 г. выплацілі толькі Віленскі, Ашмянскі, Вількамірскі, Ковенскі, Слонімскі і Ваўкавыскі паветы, Жамойцкае староства і Полацкае ваяводства. Часткова падатак выбралі Віленскі капітул, Лідскі, Браслаўскі, Трокскі, Гарадзенскі, Берасцейскі і Пінскі паветы. Увогуле не выдалі пабор 1593 г. ва Упіцкім, Новагародскім, Аршанскім, Менскім і Рэчыцкім паветах і ў Мсціслаўскім ваяводстве. На жаль, зусім не маем звестак аб выплаце падатку ў Віцебскім і Мазырскім паветах. Каля паловы атрыманых грошай, 20000 зл., былі ў тым жа 1597 г. перададзены на ўласныя патрэбы Жыгімонта Вазы, астатнія грошы пайшлі на выплаты служэбнікам каралеўскага двара, а таксама на пакрыццё выдаткаў, звязаных уласна са зборам у ВКЛ гэтага пабору (рассылка гаспадарскіх лістоў і мандатаў, аплата каморнікаў, скарбовых слуг, пасланцоў, возных і інш.).

Зразумела, скарб і на гэты раз разлічваў атрымаць прыкладна тую ж суму, што ў 1591 г. Таму з ініцыятывы Д. Халецкага як земскага падскарбія ВКЛ спецыяльнымі мандатамі былі «пазваны» адказваць перад гаспадарскім судом паборцы Віленскага капітула, Лідскага, Трокскага, Гарадзенскага,

[92] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 409адв.*

[93] *AGAD. AR. Dz. V. Nr. 1901. Cz. II. S. 87.*

[94] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 408адв.– 409.*

[95] *Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 252, 270.*

Упіцкага, Новагародскага, Аршанскага, Берасцейскага, Пінскага, Менскага і Рэчыцкага паветаў і Мсціслаўскага ваяводства. Яны абвінавачваліся ў тым, што не выдалі пабору 1593 г. у скарб і не зрабілі адпаведнай справаздачы. Сума нявыплачанага паборцамі падатку, па версіі Д. Халецкага, складала больш за 33338 зл. (не ведаем, на жаль, дакладнай сумы прэтэнзій скарбу да Аршанскага і Менскага паветаў). У суд быў «пазваны» і староста браслаўскі Януш Скумін-Тышкевіч, які нібыта не прыняў ніякіх захадаў супраць той шляхты свайго староства, якая не выплаціла паборы 1593 і 1595 гг.[96] Такім чынам, пра атрыманне надворным скарбам 100000 зл. гаворкі ўжо не ішло.

Гаспадарскі суд 29 кастрычніка 1597 г. першай разглядаў справу Я. Скуміна-Тышкевіча. Абвінавачванні з браслаўскага старосты ў выніку былі зняты, яго абавязалі 1 студзеня 1598 г. зрабіць справаздачу («лічбу») перад скарбам з рэшты пабору 1593 г.[97]

Астатнія справы разглядаліся 10 лістапада. Ад Віленскага капітула, з Лідскага, Трокскага, Упіцкага, Берасцейскага, Пінскага, Рэчыцкага паветаў і з Мсціслаўскага ваяводства на суд увогуле не з'явіліся ані паборцы, ані іх прадстаўнікі. Было вырашана, што яны павінны будуць прыбыць у Варшаву праз 4 тыдні ад абвяшчэння ім гэтага выраку і аддаць не толькі пабор, але і штрафы («віны») за несвоечасовую выплату грошай.[98] На судзе былі толькі прадстаўнікі паборцаў з Гарадзенскага, Новагародскага, Аршанскага і Менскага паветаў. Яны, як і прадстаўнік Я. Скуміна-Тышкевіча, адразу заявілі, што, адпаведна соймавым канстытуцыям і падатковым універсалам, адказваць павінны перад Трыбуналам ВКЛ, а не перад гаспадарскім судом. Аднак інстыгатар ВКЛ Мальхер Каменскі даводзіў, што справа датычыць непасрэдна скарбу і караля, таму і разглядаць яе павінен менавіта гаспадарскі суд.[99] Прадстаўнік гарадзенскага паборцы паведаміў, што Ян Клюкоўскі большую частку пабору ўжо аддаў у скарб і абяцаў выплаціць рэшту. Затое прадстаўнікі В. Зянковіча Ціхінскага, Я. Вадэрацкага і В. Балгарына тлумачылі нявыдачу пабору 1593 г. нязгодай сярод шляхты ВКЛ. Прычым калі новагародская і менская шляхта пабор плаціла, але забараняла сваім паборцам аддаваць грошы ў скарб без «аднастайнай згоды» ўсіх абывацеляў Вялікага Княства, то аршанская шляхта і да гэтага часу нічога не збірала.[100] і хаця непасрэдна прычына гэтай нязгоды не называлася, але яна была відавочнай – працягваўся канфлікт вакол віленскага біскупства, г. зн. умова, вылучаная

[96] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 234-234адв., 239-240адв., 272-275адв., 276адв.–277адв., 280-282, 283-287адв. Скарб ацэньваў суму нявыплачанага пабору наступным чынам: Віленскі капітул – 2092 зл. 15 гр., Лідскі павет – 629 зл., Браслаўскі павет – 434 зл. 7½ гр., Трокскі павет – 3090 зл. 15 гр. 14½ п., Гарадзенскі павет – 2931 зл. 8 гр. 17 п., Упіцкі павет – 5628 зл. 19 гр. 10½ п., Новагародскі павет – 9000 зл., Берасцейскі павет – 6597 зл. 16 гр. 14½ п., Пінскі павет – 1592 зл. 2 гр. 4 п., Мсціслаўскае ваяводства – 307 зл. 27 гр., Рэчыцкі павет – 1034 зл. 11 гр.*

[97] *Тамсама. Арк. 234-234адв., 239-240адв.*

[98] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 274адв.– 275адв., 280-282, 284адв.–287адв.*

[99] *Тамсама. Арк. 239адв.– 240, 272-272 адв., 273адв.– 274, 276 адв., 283-283 адв.*

[100] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 272-274, 283-283адв.*

каралю Галоўным з'ездам ВКЛ у 1593 г., так і не была выканана. М. Каменскі ад імя Жыгімонта Вазы адмаўляў падобныя аргументы і спасылаўся на рашэнні сойма 1596 г.: «де*й* то*т* побо*р* на со*й*ме в году деве*т*деся*т* шосто*м* о*т* вси*х* обывателе*й* велико*го* князства Литовско*го* згод*не* выда*ти* на*м* г [оспо]д [а] ру позволено".[101] Цалкам верагодна, што частковая ці поўная нявыплата пабору 1593 г. у некаторых іншых паветах ВКЛ таксама можа тлумачыцца незадаволенасцю шляхты канфліктам вакол віленскага біскупства.

[101] *Тамсама. Арк. 272 адв., 283 адв.*

Падчас разгляду гэтых спраў выявіўся яшчэ адзін аспект канфлікту паміж Жыгімонтам Вазам і шляхтай: каралеўская ўлада імкнулася захаваць свой аўтарытэт. Так, на просьбу прадстаўніка В. Зянковіча Ціхінскага аб скліканні ў Навагародскім павеце сойміка, на якім бы шляхта канчаткова згадзілася на выдачу пабору ў надворны скарб, інстыгатар катэгарычна адмовіў: «бо бы де*й* то не з достое*н*ствомъ нашымъ (Жыгімонта Вазы – *Ул. П.*) было о то, што на*м* ре*ч* посполитая по тры кроти даровала бо*л*шъ и масте*й* того проси*т*».[102] Кароль і паны-рада пастанавілі, каб 8 снежня 1597 г. паборцы (аршанскі паборца – 6 студзеня 1598 г.) прадставілі ў Варшаве перад скарбам справаздачу аб зборы пабору і выдалі грошы.[103]

[102] *Тамсама. Арк. 284.*

[103] *Тамсама. Арк. 272 адв.– 273, 274-274адв., 277адв., 284-284адв.*

У гэты ж час у Варшаве суд разглядаў позвы і аб нявыдачы падаткаў 1595 г. Як ужо адзначалася, грошы з гэтага пабору паступалі вельмі павольна і не ў поўным аб'ёме. У выніку, у 1597 г. жаўнеры войска ВКЛ, пакуль чакалі выплаты належнага ім заробку, разрабавалі гаспадарскія ўладанні ў Берасцейскім павеце.[104] Віну за несвоечасовую выплату падаткаў усклалі на мясцовых паборцаў, якія «немалыя сумы… пры сабе затрымалі, лічбу не ўчынілі і грошы не аддалі», за што і былі «пазваны» Д. Халецкім у гаспадарскі суд.[105] На момант правядзення судоў у лістападзе 1597 г. пабор не быў цалкам выплачаны ў Браслаўскім, Гарадзенскім, Віцебскім і Рэчыцкім паветах. Па ацэнках скарбу, у Браслаўскім павеце «многімі асобамі» не было выплачана падаткаў на суму 583 зл. 26 гр., у Віцебскім павеце сабралі толькі 300 зл., таму для выдачы пабору гэтым паветам прызначаліся пазнейшыя тэрміны.[106] Прадстаўнік гарадзенскага паборцы Я. Клюкоўскага настойваў, спасылаючыся на канстытуцыі соймаў 1593, 1595 і 1596 гг., каб справа аб выплаце пабору была перанесена на разгляд Трыбунала ВКЛ. У адрозненні ад справы з паборам 1593 г., Жыгімонт Ваза і паны-рада задаволілі гэтую просьбу.[107] Такое рашэнне можа тлумачыцца тым, што пабор 1593 г. прызначаўся асабіста каралю, а пабор 1595 г. – на дзяржаўныя патрэбы, а менавіта на абарону Рэчы Паспалітай.

[104] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 239-239адв.; AGAD. AR. Dz. V. Nr. 1901. Cz. II. S. 75, 78; Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach… S. 19.*

[105] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 355. S. 3.*

[106] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 239-240адв., 256-257.*

[107] *Тамсама. Арк. 287адв.; AGAD. AR. Dz. II. Nr. 355. S. 3-4.*

Фактычна, з пачатку 1598 г. пытанне збору ў ВКЛ падаткаў 1593 і 1595 гг. зыходзіць з палітычнай арэны. Павятовыя соймікі, якія праходзілі ў студзені 1598 г. перад чарговым вальным соймам, непасрэдна пра іх не ўзгадвалі.[108] Браслаўская шляхта, напрыклад, падкрэслівала, што яна паборы выдала, і кароль *«... in isto non caperet detrimentum»* [у тым не панёс шкоды].[109] Сойм 1598 г. склікаўся Жыгімонтам Вазам, каб зноў атрымаць згоду і фінансавыя сродкі на паездку ў Швецыю для захавання за сабой тытула шведскага караля. Соймікі ВКЛ адназначна забаранілі сваім паслам згаджацца на ўхваленне новых падаткаў. У якасці альтэрнатыўнай крыніцы атрымання грошай шляхта называла рэшты падаткаў, што збіраліся ў Княстве з 1590 г., напрыклад, з пабору 1595 г.[110] Новагародскі соймік прапанаваў на фінансаванне паездкі накіраваць чопавае, ухваленае Галоўным з'ездам 1593 г. на абарону межаў ВКЛ, а пры ўсеагульнай згодзе станаў Вялікага Княства, – і новападвышанае мыта, прызначанае на адзін год.[111]

У сувязі са складанай сітуацыяй у Швецыі, Жыгімонт Ваза не мог дапусціць зрыву сойма і пайшоў на пэўны кампраміс у канфлікце вакол віленскага біскупства. Ён адклаў разгляд гэтага пытання на наступны сойм, гарантаваўшы, што да таго моманту Б. Мацяёўскі не зойме месца віленскага біскупа ў сенаце і не будзе кіраваць уладаннямі біскупства.[112] У інтарэсах літвінаў былі і рашэнні аб адпраўцы ў Маскву ганцоў, каб пачаць перамовы аб уніі з Маскоўскай дзяржавай, ды прыняцце «Ардынацыі Інфлянцкай зямлі», што гарантавала сацыяльна-палітычныя правы шляхты ВКЛ у гэтай правінцыі.[113] Гэта відавочна задаволіла, хаця і часткова, дэлегацыю Княства. Да таго ж, палітычная эліта ВКЛ і раней падтрымлівала «шведскую» палітыку Жыгімонта Вазы, што было звязана з яе эканамічнымі інтарэсамі.

Вальны сойм 1598 г. падтрымаў планы Жыгімонта Вазы паехаць у Швецыю і згадзіўся выдаткаваць яму на паездку 300000 зл. польскіх, 1 / 3 з якіх прыпадала на долю ВКЛ. Польскі бок ухваліў дзеля гэтага пабор на адзін год, а вось літвіны, з-за голаду і неўраджаяў, прызначаць любыя падаткі адмовіліся. Патрэбныя 100000 зл. ВКЛ выдаткоўвала з рэшты пабораў 1591 і 1595 гг.[114] Па сутнасці, сойм ставіў кропку і ў справе з выплатай падатку 1593 г. У канстытуцыі «Аб мінулых паборах у ВКЛ» адзначалася, што рэшты таго пабору павінны быць аддадзены каралю і вялікаму князю. Цікава, што ў канстытуцыі да ланавага падатку далучалася і чопавае, ухваленае ў 1593 г., разам з мытам.[115] Напэўна, такім

[108] *AGAD. AR. Dz. II. NrNr. 243, 368, 370, 373, 400, 401, 402.*
*Радаман А. Інструкцыя Новагародскага сойміка паслам на Варшаўскі сойм 1598 г.;*
*Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 273;*
*Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach... S. 29, 47.*

[109] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 400. S. 1.*

[110] *Ibidem. Nr. 401. S. 1; Nr. 402. S. 2.*

[111] *Ibidem. Nr. 373. S. 1;*
*Радаман А. Інструкцыя Новагародскага сойміка... С. 100-102.*

[112] *Лаппо И. И. Люблинская уния... С. 148-149;*
*Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach... S. 80-82.*

[113] *РНБ. Ф. 971. Авт. 234. № 157. Л. 1; Rzońca J. Rzeczpospolita Polska w latach... S. 59-61, 143-144; VL. T. 2. S. 377-378.*

[114] *VL. T. 2. S. 366-367, 370.*

[115] *Ibidem. S. 370. AGAD. AR. Dz. II. Nr. 370. S. 1-2; Nr. 402. S. 4; Dz. V. Nr. 1901. Cz. II. S. 87.*

чынам надворны скарб імкнуўся ўсё ж сабраць пабор у суме, блізкай да 100000 зл.[116] Для рэвізіі выплаты ўсіх падаткаў, ухваленых з 1591 г., прызначаліся дэпутаты і вызначалася, што справы аб нявыдачы падаткаў павінны будуць разглядацца ў Трыбунале.[117]

У ВКЛ з пабораў 1591 і 1595 гг. заставалася недзе каля 114405 зл., з якіх літвіны і выдаткавалі на паездку ў Швецыю неабходныя 100000 зл.[118] З гэтага часу ў скарб паступала толькі невялікая рэшта пабору 1593 г.: у 1599 г. у Вялікім Княстве было сабрана 7000 зл.[119] Хутчэй за ўсё, гэты пабор так і не быў сабраны ў ВКЛ у поўным аб'ёме. Жыгімонт Ваза атрымаў адпаведную грашовую субсідыю ў 1598 г., а з 1600 г., калі Рэч Паспалітая ўступіла ў вайну са Швецыяй, шляхта была вымушана плаціць новыя і частыя падаткі.

Такім чынам, у 1590-я гг. ухваленне падаткаў было важным фактарам палітычнай барацьбы ў Рэчы Паспалітай і адным з найбольш праблемных момантаў у стасунках паміж Жыгімонтам Вазам і палітычнай элітай ВКЛ. Літвіны выкарыстоўвалі сваю згоду на паборы як сродак ціску на караля і вялікага князя. Канфлікт з выдачай падаткаў 1593 і 1595 гг. быў непасрэдна звязаны з прызначэннем паляка на пасаду віленскага біскупа і імкненнем літвінаў вымусіць Жыгімонта Вазу адмяніць гэтую намінацыю. Лідэрам апазіцыі быў віленскі ваявода К. Радзівіл, які актыўна выкарыстоўваў у супрацьстаянні каралю свае пратэкцыяніસцкія ўплывы сярод сенатараў і шляхецтва. Жыгімонт Ваза настойліва дабіваўся выплаты абодвух пабораў, бо меў патрэбу ў грашовых сродках на арганізацыю абароны Рэчы Паспалітай і забеспячэнне сваіх дзедзічных правоў у Швецыі. Акрамя таго, быў закрануты і аўтарытэт караля. Канфлікт паказаў адносную слабасць каралеўскай улады і яе залежнасць ад шляхты ў галіне фіскальнай палітыкі. Кароль і вялікі князь не меў уласнага апарату па зборы ў ВКЛ прызначаных соймам падаткаў. Збор пабораў знаходзіўся ў руках шляхты і абраных ёю паборцаў (падскарбіі толькі атрымлівалі ўжо сабраныя грошы і кантралявалі іх выкарыстанне). Кароль вымушаны быў ужываць іншыя сродкі ўплыву на шляхту: частае скліканне соймаў,[120] на якіх імкнуўся дабіцца ад паслоў згоды на падаткі; выклік паборцаў у Трыбунал і гаспадарскі суд; нарэшце, ціск на павятовую шляхту праз сенатараў-раялістаў і дворных ураднікаў. На баку Жыгімонта Вазы апынуліся М. К. Радзівіл, Л. Сапега, Д. Халецкі, К. Дарагастайскі і інш. Кароль і вялікі князь усё ж здолеў у пэўнай ступені дабіцца выплаты спрэчных падаткаў. Пералом у пазіцыі шляхты ВКЛ адбыўся ў 1596 г.,

[116] *Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 253, 270.*

[117] *VL. T. 2. S. 370.*

[118] *AGAD. AR. Dz. II. Nr. 355. S. 1-2; Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 227, 273, 357.*

[119] *НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 285. Арк. 603адв. Квітанцыя падскарбія А. Завішы даціравана 21 мая 1599 г.*

[120] *За 6 гадоў, з 1593 па 1598 гг., было склікана 5 соймаў. Вількамірскі і ваўкавыскі павятовыя соймікі ў студзені 1598 г. нават пратэставалі супраць такога частага склікання соймаў, бо гэта прыносіла значную шкоду шляхецкім маёнткам: AGAD. AR. Dz. II. Nr. 401. S. 1; Nr. 402. S. 4.*

калі быў у значнай ступені выплачаны пабор 1595 г., і частка «палітычнага народа» Вялікага Княства згадзілася на выдачу пабору 1593 г. Гэта можна растлумачыць шэрагам фактараў: пэўныя колы палітычнай эліты ВКЛ шукалі кампрамісу з каралём і вялікім князем, дзяржаўныя інтарэсы Рэчы Паспалітай выходзілі на першы план (абарона ад Турцыі і татар, захаванне за Жыгімонтам Вазам шведскай кароны), шляхецтва захоўвала значную павагу да каралеўскай улады. Падатак 1593 г. быў часткова выплачаны ў 1597 г., сойм 1598 г. яшчэ раз нагадаў шляхце ВКЛ аб выдачы каралю грошай з пабору. Аднак, хутчэй за ўсё, пабор у належным памеры (100000 зл.) так і не быў выбраны.

### *Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Pałucki, W. Drogi i bezdroża skarbowości polskiej XVI i pierwszej połowy XVII wieku / W. Pałucki. – Wrocław, 1974.
2. Skarbowość w Polsce i jej dzieje za Stefana Batorego / Wyd. A. Pawiński. – Warszawa, 1881;
3. Wisner, H. Próby utworzenia skarbu stałego na Litwie / H. Wisner // Kwartalnik Historyczny. – 1982. – R. 89. – № 1. – S. 85-89.
4. Rzońca, J. Sejmy z lat 1597 i 1598 / J. Rzońca; Opolskie t-wo przyjacioł nauk. – Warszawa-Wrocław, 1989. – Cz. I. Bezowocny sejm z 1597 r.
5. Rzońca, J. Rzeczpospolita Polska w latach 1596-1599. Wybrane zagadnienia polityki wewnętrznej i zagranicznej / J. Rzońca // Wyższa szkoła pedagogiczna im. Powstańców Śląskich w Opolu. – Studia i monografie, 156. – Opole, 1990.
6. Filipczak-Kocur, A. Podatki Litewskie w świetle uchwał sejmowych (1587-1632) / A. Filipczak-Kocur // Acta Universitatis Wratislaviensis. – Nr. 945. – Historia LXVI. Studia z dziejów Rzeczypospolitej szlacheckiej. – Wrocław, 1988. – S. 113-132.
7. Filipczak-Kocur, A. Z dziejów litewskiego skarbu nadwornego za Zygmunta III Wazy / A. Filipczak-Kocur // Między Wschodem a Zachodem. Rzeczpospolita XVI – XVIII w. – Warszawa, 1993. – S. 77-86;
8. Filipczak-Kocur, A. Skarb litewski za pierwszych dwu Wazów. 1587-1648 // A. Filipczak-Kocur. – Wrocław, 1994.
9. Filipczak-Kocur, A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587-1648. Projekty-ustawy-realizacja // A. Filipczak-Kocur. – Warszawa, 2006.
10. Archiwum Domu Sapiehów wydane staraniem rodziny / Wyd. dr. A. Prochaska. – T. I (listy z lat 1585-1606). – Lwów, 1892.
11. Lepszy, K. Walka stronnictw w pierwszych latach panowania Zygmunta III / K. Lepszy. – Kraków, 1929.
12. Konopczyński, W. Liberum veto: studyum porównawczo-historyczne / W. Konopczyński. – Kraków, 1918.
13. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569-1763 / A. Rachuba. – Warszawa, 2002.
14. Kempa, T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł «Sierotka» (1549-1616) wojewoda wileński / T. Kempa. – Warszawa, 2000.
15. Лаппо, И. И. Люблинская уния и третий Литовский статут / И. И. Лаппо // Журнал Министерства народного просвещения. – 1917. – № 5. – С. 89-150.

16. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн., 1989. – С. 118-119.
17. Жукович, П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г.) / П. Жукович. – Спб., 1901. – С. 85-89.
18. Wisner, H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasów Zygmunta III i Władysława IV Wazy / H. Wisner. – Wydanie II. – Warszawa, 2001.
19. Wisner, H. Opinia szlachecka Rzeczpospolitej wobec polityki szwedzkiej Zygmunta III w latach 1587-1632 / H. Wisner // Zapiski Historyczne. – 1973. – T. 38. – Z. 2. – S. 12.
20. Спірыдонаў, М. Полаччына ў сярэдзіне XVI ст. / М. Спірыдонаў // Полацкія гістарычныя запіскі. – Т. 1. – 2004. – С. 10-15.
21. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией (далей – АВАК): В 39 т. – Вильна, 1865-1915. – Т. 8. – 1874.
22. Падалінскі, У. Грамадская думка шляхты Вялікага Княства Літоўскага канца XVI ст. (на прыкладзе соймавай кампаніі Рэчы Паспалітай 1595 г.) / У. Падалінскі // Спадчына. – 2008. – № 1. – С. 12-24.
23. Seredyka, J. Senatorowie Rzeczypospolitej na sejmach Zygmunta III Wazy (1587-1632) / J. Seredyka // Rozprawy z dziejów XVI i VII wieku. – Poznań, 2003.
24. Ragauskienė, R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (Apie 1515-1584 m.) / R. Ragauskienė. – Vilnius, 2002.
25. Kempa, T. Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki / T. Kempa. // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia historica. – Poznań, 2003. – T. IX.
26. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582-1696): spis / pod red. A. Rachuby; oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba; Instytut historii PAN. – Warszawa, 2007.
27. Свяжынскі, У. М. «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага / У. М. Свяжынскі. – Мн., 1990.
28. Seredyka, J. Marszałkowie izby poselskiej za Zygmunta III Wazy / J. Seredyka // Władza i społeczeństwo w XVI i XVII w. Prace ofiarowane A. Mączakowi w sześćdziesiątą rocznicę urodzin. – Warszawa, 1989.
29. Dyaryusze sejmowe roku 1597. W dodatkach: akta sejmikowe i inne odnoszące się do tego sejmu / Wyd. E. Barwiński. – Kraków, 1907.
30. Радаман, А. Інструкцыя Навагародскага сойміка паслам на Варшаўскі сойм 1598 г. / А. Радаман // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2005. – № 2. – С. 97-109.
31. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.
32. Volumina Constitutionum. – T. II (1550-1609), vol. 1 (1550-1585). – Warszawa, 2005
33. Volumina Legum. Przedruk źbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wydanego: W 8 t. – Petersburg, 1859-1860. – T. 2. – 1859.
34. Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie. Archiwum Radziwiłłów
35. Archiwum Domu Radziwiłłów. – Kraków, 1885.
36. AGAD. Archiwum Publiczne Potockich.
37. Российская национальная библиотека в Санкт-Петербурге
38. Biblioteka Miejska im. Raczyńskich w Poznaniu.

*Дата паступлення ў рэдакцыю 12.06.2008.*